# БЕЛАРУСКАЯ МОВА І МАБІЛЬНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ

*Кавалёў М.У., Губін У.М.*

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

*Албут А.А. – старшы выкладчык*

У рабоце разглядаецца гісторыя выкарыстання беларускай мовы ў мабільных тэхналогіях. Апіюваецца становішча з'явы на працягу часу, даюцца прапановы для палепшэння статыстыкі распаўсюджвання і спажывання беларускай мовы ў мабільных тэхналогіях.

Дасканала вядома, што мабільныя тэхналогіі з цягам часу ўсё больш уплятаюцца ў паўсядзённасць жыцця. іх зліццё з чалавечымі працэсамі моцна ўплывае на характар выкарыстання людзьмі прылад і вэб-старонак. Вялікую ролю ў сродках сувязі і атрымліванні інфармацыі грае мова і яе функцыяванне ў мабільнай прасторы. У гэтай працы мы разгледзем гюторыю ўжывання беларускай мовы ў вэб-асяроддзі і прыладах. Таксама паспрабуем вызначыць, у якім напрамку ідзе сучаснае развіццё беларускамоўнай мабільнай прасторы.

Што датычыцца жыццядзейнасці беларускай мовы ў вэб-асяроддзі, трэба згадаць беларускую Вікіпедыю, якая яшчэ ў 2004 годзе ўпершыню ўбачыла свет адразу ў дзвюх варыянтах правапіюу: акадэмічным (афіцыйным) і класічным (тарашкевіцы). У выніку Вікіпедыя з акадэмічным правапіюам перасягнула Вікіпедыю

з класічным. У жніўні 2015 года акадэмічная беларуская энцыклапедыя дасягнула 100000 артыкулаў [1]. Таксама, мы можам сказаць пра тое, што сацыяльная сетка «Укантакце» адна з першых дадала магчымасць выкарыстоўвання беларускамоўнага інтэрфейса. Спачатку ў сетке юнавала беларуская мова з класічным правапіюам, але потым таксама быў дадены акадэмічны правапіў. Гэтая з'ява адна з першых пасадзейнічала распаўсюджванню беларускай мовы сярод людзей у мабільнай прасторы. Ужо ў 2015 годзе паводле наяўных данных беларускай версіяй сайта з акадэмічным правапіюам карысталіюя ў сярэднем 6000 людзей, з класічным правапіюам – 7700 [2].

Калі мы гаворым пра аперацыйныя сютэмы, трэба адзначыць, што ў 2016 годзе ўладальнікі некаторых смартфонаў змаглі выкарыстоўваць мабільныя прылады на беларускай мове. Напрыклад, магчыма было перакласці на яе такія смартфоны, як Samsung Galaxy A7 і Samsung Galaxy J5. Канешне, гэта не забяспечыла цалкага выкарыстоўвання беларускай мовы: некаторыя праграмы былі на англюкай, бо не ўсе яны маглі падтрымліваць адпаведную прыладзе моўную версію. Тым не менш, данныя спробы паказалі, што выкарыстанне беларускай мовы ў прыладах магчыма [3].

З цягам часу ўсё больш праграм атрымлівалі магчымасць іх выкарыстання на беларускай мове. Вялікая колькасць вэб-старонак і праграм, якія падтрымліваюць беларускамоўны інтэрфейс, з'яўляюцца беларускімі. Напрыклад, у 2019 годзе ў беларускі мэсанджар Viber была дадана родная мова [4]. Беларускія дзяржаўныя сайты, такія як афіцыйны сайт БДУіР, маюць магчымасць абіраць беларускую мову для карыстання замест рускай і іншых. Таксама беларуская мова распаўсюджана сярод тых вэб-старонак, якія звязаны з культурай, напрыклад вялікі віртуальны кнігазбор «Беларуская палічка», дзе прадстаўлены тысячы кніг.

Але, трэба заўважыць, што нават у нашы дні не ўсе мабільныя тэхналогіі падтрымліваюць беларускую мову. Напрыклад, прылады з аперацыйнай сютэмай IOS маюць беларускую раскладку клавіятуры, але не беларускамоўны інтэрфейс. Замежныя сацыяльныя сеткі, такія як Instagram, Facebook і г.д. таксама не маюць беларускамоўнага інтэрфейсу. Акрамя гэтага, ёсць рознага кшталту праблемы з жыццядзейнасцю юнуючай беларускамоўнай прасторы. Напрыклад, якасць перакладчыка Google на беларускую мову недасканалая, як і ўвогуле якасць беларускамоўнай інфармацыі на некаторых вэб-старонках і сайтах.

Паводле слоў Аляксандра Лукашанца, беларуская мова ўваходзіць у два першых адсотка моў, прысутных у інтэрнеце [5]. Таксама, з даследавання венгерскага лінгвіюта Андраша Карная «Лічбавая смерць моў», апублікаваным у 2013 годзе, мы ведаем, што беларуская мова дастаткова шырока прадстаўлена ў інтэрнеце [6]. Гэта значыць, што беларускамоўнага кантэнту ў сеціве шмат і ён інтэнсіўна папаўняецца не толькі за кошт афіцыйных парталаў, але і блогаў з сацыяльнымі сеткамі. Гэта добра, што беларускамоўныя матэрыялы разнапланавыя, і мова сацыяльных сетак жывая і запатрабаваная. Тым не менш, вялікая колькасць інфармацыі з'яўляецца дзякуючы менавіта энтузіястам, і кантэнт папаўняецца стыхійна. З-за мабільных тэхналогій, беларуская мова не толькі распаўсюджваецца, але і аднаўляецца: з'яўляюцца новыя словы, новы маладзёжны слэнг. Але ў даннай прасторы таксама разбураюцца нормы правапію і маўлення, бо неафіцыйныя крыніцы могуць не вылучацца асаблівай якасцю інфармацыі.

Вялікую ролю ў гіюторыі выкарыстання беларускай мовы ў мабільных тэхналогіях грае мэтанакіраванасць на палепшванне і ахову становішча мовы ў будучыні.

Падсумоўвая сказанае вышэй, можна вызначыць, што беларуская мова ў мабільных тэхналогіях юнуе, з'яўляецца запатрабаванай, але не заўсёды рэалізуецца ў выкарыстоўванні. Мы сабралі некалькі парад, якія могуць дапамагчы палепшыць дынаміку распаўсюджвання і захоўвання беларускай мовы ў мабільнай прасторы:

Трэба звярнуць увагу на стварэнне афіцыйнай падтрымкі, цэнтралізаванай і сютэмнай дзейнасці, каб з'яўлялася больш афіцыйных, змястоўных, інфарматыўных сайтаў, прыдаткаў і прылад, якія б мелі вагу сярод неаўтратытэтных крыніц.

Патрэбна падтрымка з боку дзяржавы, каб беларуская мова была прадстаўлена ў інтэрнэце. Неабходна звярнуць увагу на распрацоўку і прыняцце дзяржаўнай праграмы па пашырэнні беларускай мовы і яе вызначэння як асноўнай мовы ў кібер-прасторы.

Патрэбна падтрымка менавіта ад IT-сферы: ад напісання праграмы да ўкаранення.

Неабходна наяўнасць дастатковай дабраякаснай лінгвіютычнай базы і яе поўная прэзентацыя — у інтэрнэце павінны прысутнічаць у свабодным доступе асноўныя слоўнікі, граматыкі, спецыяльныя даведнікі. Таксама павінны стварацца і ўдасканальвацца дапаможныя і навучальныя праграмы.

Вельмі важна, каб у інтэрнэт-прасторы было як мага шырэй прадстаўлена нацыянальна-культурнае і інфармацыйна-забаўляльнае беларускамоўнае поле.

Трэба не забываць па-першае пра развіццё менавіта не віртуальнай, а жывой беларускай мовы ў непасрэднай міжасабовай камунікацыі.

Неабходна сачыць за дынамікай выкарыстоўвання беларускай мовы ў мабільных тэхналогіях і штодзённым жыцці, каб разумець, у якім кірунку працягваць працу.

У заключэнне, мы можам сказаць, што мабільныя тэхналогіі граюць вялікую ролю ў жыццядзейнасці і жыццяздольнасці беларускай мовы. Праз гэтую працу мы даведаліюя пра развіццё беларускай мовы ў мабільных тэхналогіях, вызначылі праблемы яе юнавання і далі парады для яе далейшага ўкаранення.

**Спіс выкарыстаных крыніц:**

*1.Вікіпедыя [Электронны рэсурс].– Рэжым доступу: https://be.wikipedia.org/wiki/%D0%91%D0%B5%D0%BB%D0%B0%D1%80%D1%83%D1%81%D0%BA%D0%B0%D1%8F_%D0%92%D1%96%D0%BA%D1%96%D0%BF%D0%B5%D0%B4%D1%8B%D1%8F. – Дата доступу: 22.04.2024.*

*2. Как соцсеть «ВКонтакте» получила белорусскую версию? [Электронны рэсурс].– Рэжым доступу: https://www.kv.by/content/334195-kak-sotsset-vkontakte-poiuchiia-belorusskuyu-versiyu. - Дата доступу: 22.04.2024.*

*3. У смартфоны з Android дададзена беларуская мова [Электронны рэсурс].– Рэжым доступу: https://mediabrest.by/peopie-news/%D0%BE%D0%B1%D0%BE-%D0%B2%D1%81%D1%91%D0%BC/u-smartfony-z-android-dadadzena-beiaruskaya-mova. - Дата доступу: 22.04.2024.*

*4. В Viber добавили белорусский язык [Электронны рэсурс].– Рэжым доступу: https://www.bobriife.by/news/v-viber-dobaviii-beiorusskij-yazyk. - Дата доступу: 22.04.2024.*

*5. Белорусский язык широко распространен в Интернете, значит, он востребован [Электронны рэсурс].– Рэжым доступу: https://www.beita.by/opinions/view/belorusskij-jazyk-shiroko-rasprostranen-v-internete-znachit-on-vostrebovan-2589#bounce. - Дата доступу: 22.04.2024.*

*6. Мова анлайн. Ці дапамагаюць нам новыя інфармацыйныя тэхналогіі гаварыць і пісаць па-беларуску? [Электронны рэсурс].– Рэжым доступу: https://ssriab.by/wp-content/uploads/2020/03/smi-pra-nas_zvyazda_mova-anlajn.czi-dapamagayucz-nam.pdf. – Дата доступу: 22.04.2024.*